ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 8 (1277) | НЯДЗЕЛЯ, 11-га студзеня 1931 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:

1 месяц	30 кап.
3 месяцы	90 „
6 месяцаў	1 р. 80 „
1 год	3 р. 30 „

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

X ЗЬЕЗД ЛКСМБ

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ ЛЕНІНА УсеЛКСМ БЫЎ І БУДЗЕ УДАРНАЙ БРЫГАДАЙ НА ЎСІХ ФРАНТОХ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ БУДОЎЛІ

Даклад тав. Наумава аб рабоце ЦК УсеЛКСМ*)

Спаборніцтва і ўдарніцтва—асноўныя мэтады работы

Галоўную ўвагу ў сваім кіраўніцтве Цэнтральны Камітэт комсамолу ўдзяляў мобілізацыі актыўнасьці комсамолу і ўсёй працоўнай моладзі на выкананьне пастаўленых задач у галіне індустрыялізацыі краіны, у галіне разьвіцьця прамысловасьці. Як вы ведаеце, мы к моманту VIII зьезду мелі толькі крупінкі вопыту, як мы выражаліся на 8 зьезьдзе. Мы мелі пераклічкі, конкурсы, ініцыятыўныя групы і г. д., якія ўжо давалі нам, так сказаць, агульную пэрспэктыву, па якой павінен разьвівацца комсамол.

Мы павінны былі дабіцца таго, каб гэтыя дасягненьні ня былі крупінкамі, а каб увесь комсамол быў актыўным удзельнікам у соцыялістычным будаўніцтве.

Як вы ведаеце, УсеЛКСМ зьяўляецца ініцыятарам і організатарам соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Ленінскі комсамол па свайму пачыну і вельмі ўдалаператварыў ідэю Уладзімера Ільліча Леніна аб соцспаборніцтве і ўдарніцтве. Усе вы ведаеце і многія з вас самі былі ініцыятарамі ў організацыі соцспаборніцтва і ўдарніцтва, і таму вам вядома, якія агромністыя перашкоды і цяжкасьці ўсё гэта перажывала на першы час свайго разьвіцьця. Клясавы вораг адразу зразумеў, што соцспаборніцтва будзе важнейшым мэтадам у соцыялістычнай будоўлі і таму клясавы вораг накіраваў усе свае натугі да таго, каб сарваць соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Вы ведаеце, што опортуністыя прарочылі пагібель соцспаборніцтва і ўдарніцтва і ня толькі не дапамагалі яго разгарнуць, але дапамагалі клясаваму ворагу зрываць соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Ставілі палкі ў колы.

Гультаі, прагульшчыкі, рвачы ўсяляк імкнуліся сарваць разгортваньне соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Але, ня гледзячы на ўсе перашкоды, Ленінскі комсамол організаваў ударныя брыгады на асноўных вучастках нашага гаспадарчага будаўніцтва. У гэтым, бязумоўна, вялікую ролю сыграла кіраўніцтва Цэнтральнага Камітэту, бо Цэнтральны Камітэт у сваей рабоце пытаньні соцспаборніцтва і ўдарніцтва ня толькі ня выпусьціў з-пад свайго кіраўніцтва, але усяляк падымаў на прынцыповую вышыню, дапамагаў саюзу разгортваць соц. спаборніцтва.

Даволі сказаць, што Цэнтральны Камітэт адразу ў першы час разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва паслаў 50 членаў ЦК і групу комсамольскіх работнікаў у дапамогу мясцовым організацыям на фабрыкі і заводы, у шахты, капальні і на чыгуначны транспарт для разьвіцьця соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Мы маем цэлы шэраг пастаноў ЦК, заклікаючых саюз на шлях соцспаборніцтва і ўдарніцтва.

Усё гэта забясьпечыла такое становішча, што соцспаборніцтва і ўдарніцтва с т а л а н я толькі справай комсамолу і рабочай моладзі, але яно перарасло ў агульны-рабочы рух, стала справай усяго пролетарыяту Савецкага Саюзу. стала справай усіх працоўных нашай краіны.


Соцспаборніцтва моцна было падтрымана партыяй. 16-я Усесаюзная партконфэрэнцыя выступіла з адозвай да рабочае клясы і ўсіх працоўных нашай краіны аб актыўным падтрыманьні комсамолу ў справе разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцтва. 16-я партконфэрэнцыя сказала, што соцспаборніцтва і ўдарніцтва зьяўляецца асноўным мэтадам соцыялістычнай будоўлі.

Мы павінны проста сказаць, што менна, і ў першую чаргу, разгорнутае па нашай ініцыятыве соцспаборніцтва і ўдарніцтва далі нам магчымасьць высунуць лёзунг выкананьня пяцігодкі ў 4 гады. Вы ведаеце, што соцспаборніцтва і ўдарніцтва дапамагло нам у асноўным забясьпечыць выкананьне намечанай програмы у першым годзе пяцігодкі.

Спаборніцтва і ўдарніцтва забясьпечыла нам магчымасьць дабіцца яшчэ большых тэмпаў у другім годзе пяцігодкі. Спаборніцтва і ўдарніцтва, бязумоўна, зьяўляецца асноўнай прадпасылкай к таму, каб выканаць намечаную бальшавіцкую програму на трэці год барацьбы за выкананьне пяцігодкі.

Ад ударных брыгад да ўдарных цэхаў-заводаў

Але тым ня менш, сьнежаньскі пленум ЦК канстатаваў, што гаспадарчыя пытаньні ўсё-ж не зьяўляюцца асноўнымі ў рабоце нашай комсамольскай організацыі, што тэмпы работы комсамолу часьцяком адстаюць ад тэмпаў будаўніцтва і ад актыўнасьці перадавых пластоў рабочай моладзі. Сьнежанскі пленум ЦК ужо высунуў больш разгорнуты лёзунг аб пераводзе соцспаборніцтва і ўдарніцтва на



У прэзыдыуме зьезду

больш высокую ступень, на ступень рацыяналізацыі, ступень разьвіцьця тэхнічнай пісьменнасьці і г. д. Сьнежаньскі пленум ЦК высунуў лёзунг. „Ад ударных брыгад—да ударных цэхаў, ад ударных цэхаў—да ўдарных заводаў“.

Пасьля сьнежаньскага пленуму ЦК у справе разьвіцьця соцспаборніцтва і ўдарніцтва мы маем яшчэ больш грандыёзныя посьпехі. Калі па Маскве на 3 сакавіка 1930 г. ахоп рабочай моладзі ўдарным рухам складаў 42,6 проц., а членаў комсамолу было 43,6 проц., дык к моманту сьнежаньскага пленуму ЦК мы мелі значна меншы процант. Па 7 саюзах: хэмікаў мэталістых, тэкстыльшчыкаў, папернікаў, дрэваапрацовачнікаў і сельскагаспадарчых рабочых на 440 прадпрыемствах было ахоплена ўдарнымі брыгадамі на 1 студзеня 30 году 27,8 проц., а на 1 сакавіка—62,5 проц.

Цэнтральны Камітэт комсамолу дабіваўся таго, каб пагалоўна уцягнуць комсамольцаў у спаборніцтва і ва ўдарныя брыгады. Мы змаглі дабіцца за апошні год у гэтых адносінах вялікіх посьпехаў. Калі па Ленінградзе, па цэлым шэрагу буйнейшых заводаў як завод „Электрык“, было ахоплена 14 проц. к моманту сьнежаньскага пленуму ЦК, на заводзе „Лібкнэхта“ —15 проц., дык зараз па буйных ленінскіх заводах процант ахопу комсамолу ўдарнымі брыгадамі і спаборніцтвам ужо складае 80-90-95 проц., а ў сярэднім комсамол ленінградзкіх заводаў ахоплен на 75 проц. Па 11 прадпрыемствах Бранскага раёну ўдарныя брыгады ахапілі 75 проц. комсамольцаў. Гэтыя лічбы характэрны ня толькі для Ленінграду, гэта ў асноўным агульны малюнак нашага прамысловага комсамолу. У асноўных пролетарскіх цэнтрах, у асноўных прамысловых організацыях комсамол ахоплен зараз спаборніцтвам і ўдарніцтвам больш чым на 75 проц.

Вы ведаеце, што разам з УсеЦСПС, па ініцыятыве Цэнтральнага Камітэту комсамолу, быў організаваны 1-шы Усесаюзны Зьезд ударнікаў, які падсумаваў першыя дасягненьні ў адносінах разьвіцьця спаборніцтва і ўдарніцтва, даў далейшую програму яго разьвіцьця. Разам з новым кіраўніцтвам ВЦСПС організаваны ленінскі заклік ударнікаў, у большасьці месц падвоіўшы колькасьць ударнікаў.

Прыклады гэроічнай барацьбы

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва—гэта магутны рычаг соцыялістычнага наступленьня на ўсім фронце. Соц. спаборніцтва і ўдарніцтва дзелавы выраз рэволюцыйнай самакрытыкі мас, які мобілізуе ўнутраныя рэсурсы на выкананьне 5 годкі ў 4 гады, на разьвіцьцё найбольш хуткіх тэмпаў у нашай краіне. Комсамол прамысловых раёнаў у вельмі многіх мясцох быў носьбітам найбольш высокіх тэмпаў у разьвіцьці нашай соцыялістычнай гаспадаркі.

Даволі прывесьці некалькі прыкладаў.

Вось прыклад з гэроічнай барацьбы і работы Сталінградзкага трактарнага волата: Зборка, клёпка і ўстаноўка конструкцыі замест 63 дзён была праroблена ў 28 дзён, кавальскі цэх замест 170 дзён пабудаваны ў 45 дзён. Галоўную ролю ў гэтай справе адыгралі брыгады з перадавых комсамольцаў Сталінградзкага трактарнага заводу. Яны працавалі на вялікім марозе, адмарожваючы пальцы шклілі цэхі і зьбіралі конструкцыі. Яны дапамаглі ў значнай меры скараціць тэрмін будаўніцтва Сталінградзкага трактарнага заводу.

На Ніжагародзкім аўтобудзе маюцца брыгады з комсамольцаў і моладзі па 300-500 чал., якія па першаму заклічу партыі, комсамольскіх організацый і адміністрацыі, будуючай аўтомобільны гігант, і днём і уночы ў любую хвіліну ідуць ліквідаваць прарывы, ідуць перамагаць „вузкія месцы“; зьнішчаць недахопы. Гэройскія прыклады, аб якіх вы чыталі ня мала ў друку, гавораць аб тым, што моладзь на гэтым заводзе пад кіраўніцтвам комсамолу таксама актыўна змагаецца за хуткі тэмп пабудовы заводу. Вы чыталі матар'ял аб Днепрабудзе, дзе даюцца сусьветныя рэкорды, дзе б'юцца амэрыканскія тэмпы, дзе мы ў гэтых адносінах робім агромністыя посьпехі. Комсамольцы там знаходзяцца на перадавых позыцыях будаўніцтва.

Вось прыклады.

З Магнітагорскага будаўніцтва: „скразная комсамольская брыгада Худова многія ночы не вылезала наверх з катлавінаў, з нябачнай упартасьцю адкачвала ваду, каб ня спыняць батаніроўку бычкоў“.

„Комсамольская брыгада арматуршчыкаў Раманава назвала сябе буксірнай брыгадай і, пасьля 10 гадзін працы, ішла туды, куды яе клікалі прарывы“.

Комсамольцы Плаціны былі ў першых шэрагах штурмавых калён. Шмат прыкладаў гэроічнай працы далі комсамольскія брыгады Пласьцінкіна, Хлудава, Раманава, Шашава, Сабунаева, Удовіна і Цыганкова. Ударная работа гэтых брыгад паслужыла таму, што 2-х тысячны колектыў рабочых высунуў прапанову назваць стаў імем „X зьезду комсамолу“.

Можна прывесьці цэлы шэраг іншых прыкладаў, якія гавораць аб вялікім энтузіязьме, вялікай ініцыятыве Магнітагорскіх комсамольцаў, якія пабудавалі стаў (плаціну) раней тэрміну.

Вы ведаеце, што мы сапраўды за гэты прамежак часу, асабліва за апошні год, зьяўляемся сапраўды ўдарнай брыгадай, якая скрозь і ўсюды выяўляе сваю ініцыятыву, свой пачын. Чвэртка мільёну комсамольцаў, г. зн. 250 тыс., перакінуты на самыя адказныя вучасткі нашага будаўніцтва, у тым ліку і ў самыя адлеглыя куткі соцыялістычнай будоўлі. Мы мобілізавалі комсамольцаў на Сталінградзкі трактарны завод, паслалі туды 7000 чал.; мы мобілізавалі 30000 комсамольцаў на Донбас. Мы паслалі многа тысяч комсамольцаў на іншыя заводы,—на Магнітагорскі завод, Чалябінскі трактарны, Р а с т о ў с к і, Сельмаш і шэраг іншых. Мы паслалі тысячы комсамольцаў на лесасплаў, лясныя распрацоўкі ў адлеглыя мясцовасьці Паўночы і Усходу. Гэтымі комсамольцамі, мобілізаванымі намі на адказныя вучасткі будаўніцтва, у шмат якіх выпадках мы забясьпечылі выпраўленьне прарываў. забясьпечылі перамогу вузкіх месц, забясьпечылі выкананьне намечаных плянаў.

Лабавіўшы яшчэ аб тэй гіганцкай рабоце, якую мы прарабілі па лесасплаву і на лесараспрацоўках і г.д.—усё гэта прыклады тэй агромністай работы, якую вядуць нашы комсамольцы на пабудове гіганцкіх заводаў у нашай краіне.

Бярэм вышыні плянаваньня

Комсамол зьяўляецца ініцыятарам у справе разьвіцьця вышэйшай формы спаборніцтва і ўдарніцтва. Плянаваапэрацыйныя групы, сустрэчны прамфінплян, скразныя ўдарныя брыгады, рацыяналізатарскія рахункі і цэлы шэраг іншых форм, якія сьведчаць аб тым, што мы сапраўды ўступілі не на словах, а на справе на шляху ўздыму спаборніцтва і ўдарніцтва—на больш высокую ступень рацыяналізацыі выняходства.

Рашэньне ЦК УсеКП(б) ад 3 верасьня і рашэньне ЦК КСМ ад 4 верасьня ўзьняло новую хвалю актыўнасьці і энтузіязму ў асяродзьдзі комсамолу і рабочай моладзі і ў шмат якіх выпадках, на многіх прадпрыемствах іменна гэтыя рашэньні ЦК УсеКП(б) і ЦК КСМ і новая хваля актыўнасьці, энтузіязму ў асяродзьдзі рабочае клясы, большай часьцю рабочае моладзі, —забясьпечыла ліквідацыю вытворчых прарываў і выкананьне заданьняў даных на 2 год 5-годкі.

Праўда, ня мала і такіх організацый, якія ня здолелі ў выстарчальнай меры выкарыстаць адозву ЦК УсеКП(б) і ЦК КСМ для мобілізацыі актыўнасьці на ліквідацыю вытворчых прарываў, дзякуючы чаму шэраг прадпрыемстваў і шэраг заводаў, ня гледзячы на адозву ЦК УсеКП(б) і ЦК КСМ, усё-ж ня здолелі цалкам выканаць намечаныя програмы.

У нас маецца ня мала і буйных недахопаў у паасобных організацыях ў справе выкананьня прамфінпляну на заводах і прадпрыемствах. У нас маюцца паасобныя адстаючыя вучасткі ў нашых організацыях.

Узяць хаця-б Донбас, які адстаў ад усяго Саюзу, дзе комсамол ня здолеў мобілізаваць, ак належыць, усю комсамольскую організацыю моладзі на ліквідацыю прарываў і выкананьне прамфінпляну па Донбасе. Організацыі Донбасу, у большай частцы і комсамольская організацыя ня здолелі выкарыстаць і такі вагар, як мэханізацыя, каб выканаць намечаныя пляны, даць краіне столькі вугалю, колькі патрабуе партыя і ўрад.

Мы маем такія выпадкі, калі напрыклад, ня гледзячы на дасканалыя ўзоры энтузіязму, актыўнасьці і гэроічных прыкладаў, якія меў Сталінградзкі трактарны завод у галіне ўдзелу комсамолу ў час пабудовы заводу, ЦК КСМ і партыя прызналі нездавальняючай работу комсамолу ў галіне выкананьня програмы па выпуску трактароў.

Праўда, за апошні час пляновы выпуск трактароў у Сталінградзе значна павялічыўся, але завод усё яшчэ не дабіўся патрэбных тэмпаў у выкананьні програмы.

Транспарт—вузкае месца

Мы маем цэлы шэраг буйнейшых недахопаў на транспарце. Вы ўсе ведаеце, што транспарт гэта наша вузкае месца і трэба сказаць, ня толькі таму, што трэба рацыяналізаваць транспарт і правесьці шэраг рэконструкцыйных мерапрыемстваў. Усё гэта праўда. Але разам з тым мы маем цэлы шэраг буйнейшых недахопаў у рабоце комсамольскай організацыі на транспарце. На транспарце мала моладзі ахоплена соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам. КСМ дрэнна змагаецца з разгільдзяйствам на транспарце, дрэнна змагаецца за ўзьняцьце працоўнай дысцыпліны, за ліквідацыю прарываў, за мобілізацыю ўвагі на рацыяналізацыю транспарту, на палепшаньне яго работы. Цэлы шэраг іншых прыкладаў сьведчыць аб тым, што паасобныя організацыі маюць буйнейшыя недахопы і нам трэба будзе ў далейшай рабоце ўсяляк дабівацца выраўніваньня фронту ўдзелу ў гаспадарчым будаўніцтве, падцягнуць паасобныя ячэйкі і організацыі, узварушыць іх для таго, каб яшчэ больш узьняць актыўнасьць і ініцыятыву ленінскага комсамолу і ўсёй моладзі на выкананьне агромністай програмы, прынятай на 3 год 5-годкі.

Паварот да колгаснага руху

Вы ведаеце, што вясковы КСМ таксама дабіўся з моманту 8 зьезду, за прамежак 2 з паловай год, вялікіх посьпехаў у рабоце. Перад вясковым комсамолам 8 усесаюзны зьезд паставіў цэнтральнай задачай у вёсцы актыўны ўдзел у вытворчым коопэраваньні бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. 8 зьезд адзначыў: „Толькі гэты шлях, шлях колектывізацыі, забясьпечвае ўздым дабрабыту бядняцка-серадняцкіх мас“.

(Працяг будзе)

*) Працяг. Пачатак глядзі ў № 7.

Слова ў комсамольскіх спрэчках


ПЯТРУСЬ БРОЎКА

Прамова на X зьездзе ЛКСМБ 10 студзеня

У бойках
    за права
    быць сынам комуны
мускулы б'юцца
    у пляне сустрэчным.
Дазвольце, таварышы,
    вершам з трыбуны
слова узяць
    у комсамольскіх спрэчках.
Партыя знае
    самых найлепшых,
партыя знае
    самых здаровых.
Партыя кліча
    і мы ідзем першымі
в самай гарачай,
    юнацкай кроўю.
Працуем мы там
    куды нас паставяць—
зямлю ўзьнімаем,
    капаем руду.
Таварышы!
    вельмі вялікая
    справа—
праверыць сябе
    на хаду.
Вялікая сіла
    мы ў творчым пляне—
    кіруем пасамі,
        нішчым прастой.
Мы бальшавіцкае
    заданьне
павінны выконваць
    на ўсе,
        на сто.
Разьбіць прагулы
    ўшчэнт, на пух
Зьмесьці
    нядбайства горы.
Мы вышлі
    слухаць уважна
        пульс
кожнага матору.
І хіба мы
    на поўдарозе станем,
калі так шугае
    рухавік?
На парадку дня
    у нас першае пытаньне—
Барацьба за якасьць
    і за лік.
І з брыгад на цэхах
    і з брыгад
        на полі.
Адкідаючы гультайства
    і ману,
Мы гаворым:
    ты не комсамолец,
Калі ты ўдарнасьць
    праміпуў,
Калі ты ад бойкі
    ўцёк,
гультая ў сабе
    не перамог.
Хіба так
    змагацца за жыцьцё
нас бацькі
    вучылі на франтох?

Мы—сыны барацьбы—
    адвідаем парадкасьць.
Час—гэта самыя
    модныя сродкі.
Комсамольцы выходзяць
    ударным атрадам
ў вялікія дні
    пяцігодкі.
Нас клікалі шахты—
    мы далі ў шахты,
Нас клікала мора—
    мы далі на моры,
нас звалі акопы—
    мы далі ў акопы
усюды сваіх
    маладых і здаровых.
І вось, каб цяпер
    пачаць пераклічку
творчых каморак
    краіны нашай—
галасоў комсамольцаў
    не пералічыш,
не перамерыш
    і ня узважыш!
З-пад зямлі
    і з пад гор—
        комсамолец шахцёр,
Майстрые трос—
    комсамолец матрос,
на ліцейным—вагранывік
    комсамолец—ударнік,
Па вучобу ідзе—
    комсамолец студэнт.
Такім не загадаеш:—
    стойце!
Энэргія—шырэй
    ракі.
Гэта растуць, ідуць
    комсамольцы—
        маладыя бальшавікі.
І калі б'юцца ў нас
    творчыя жылы,—
і як байцоў
    і як палітыкаў,
партыя нас навучыла
    сябе праверяць
        самакрытыкай.
І ўсе нашы дні
    стаўляючы ў строй,
праз бальшавіцкі вопыт,—
    мы бачым самы
        сапраўдны рост,
зьнішчаем свае недахопы.
І павінен ведаць
    комсамолец
у гэтыя рашаючыя
    дні—
мала быць
    ударнікам на полі,
трэба ведаць
    поля організм.
Трэба ведаць,
    што гарыць, што гасьне,
дзе машынай узяць,
    а дзе рукой.
А нас многа
    сёньня ў колгасе,

толькі мала ў ім
    плянавікоў.
Досыць нам работы
    самапасам,
трэба сьвет
    нанова пераліць.
Слухайце,
    таварышы з колгасаў!
станьце
    камандзірамі зямлі.
Каб ракой буяніла
    пшаніца,
каб аўсы шумелі
    навальніцай,
каб сьцяной стаяла
    канюшына,
каб была
    нястомнаю машына.
Зямля кліча
    новае механікі,
каб жыта
    вазёрамі кулі.
Выхадзі,
    комса-ударнікі,
на палі!
Каб агні у нас
    буянілі
ў маладых.
Спаласуем магістралямі
балаты.
Мы спраўляем
    новую кашулю.
Прэч мяжа!
На балотах нашых забушуе
сенажаць.
Мы сваю краіну
    перамерылі,
у цяжкім поце
    мы пазналі толк,
Комсамольцы
    сталі інжынэрамі,
Комсамольцы
    на усіх франтох.
На рабоце
    толькі нам
        цьвісці,
гартаваньня агнямі
    кожны.
Мы пасобім партыі
    вясці
бальшавіцкі сьцяг
    непераможны.
Хай цяпер
    па комсамольскіх лыжах
прабяжыць
    комуністычны ток:—
з барыкад Варшавы
    і Парыжа
маладых
    спаткаць
        барацьбітоў.
Хіба з нас у бойках
    калі стоміцца,
хоць снарад
    раскіне сьмерці
        медзь.
Наш язык
    калі не дагаворыцца—
будзе сэрца
    праўду разумець.
Досыць вас
    ў падпольлі заганяць,
Комсамол, за волю
    галасуй!
Сьцяг комуны
    можна прачытаць
калі крыўду
    грудзі пранясуць.
Перарвалі мы
    ланцуг,
Адчынілі дзьверы.
    Што узялі—
        замацуй,
а цяпер—
    наперад!
Мы прышлі сюды усе
    гаварыць жыцьцё
прымусіць.
Хай жыве X зьезд
    комсамольцаў Беларусі!
Мы вырасьлі—
    упартая
Савецкая зямля!
„Мы маладая гвардыя
рабочых і сялян“.



...Мускулы б'юцца ў пляне сустрэчным...

Пройдзеных шляхоў— не адабраць!

Любыя, дарагія таварышы!

Вечарам на зьезед прынесьлі ваш ліст. Ён дайшоў да нас, захаваўшы ў сабе шчырасьць вашых слоў і думак. Яны палымнелі над прыціхшай заляй. Вам аплёдыравалі, дарагія таварышы па клясе. Вашу рашучасьць у далейшай барацьбе мы чыталі на тварах дэлегатаў. Вашу ўпэўненую хаду да перамог мы адчулі па ўсёй краіне нашай.

Турэмныя краты адзіночак, прымежныя кардоны і заставы не змаглі затрымаць вашага вітаньня.

— З глыбокага падпольля,—пісалі вы,—ад імя комсамоліі Заходняй Беларусі мы шлём Х-му зьезду Ленінскага комсамолу наша шчырае комсамольскае прывітаньне.

— Мінула ўжо дзесяць год з таго часу, як мы, гвалтам адлучаныя польскім імпэрыялізмам ад вас, пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, КСМ Польшчы і КІМ'у, у нязьмерна цяжкіх варунках вядзем барацьбу з белапольскай крывавай окупацыяй.

... Мінула дзесяць год.

Дзесяць год упартага змаганьня.

Дзесяць год змаганьня і перамог...

Мы—статысячная армія комсамолу Беларусі, фарпост ленінскага чырвонаштандартнага УсеЛКСМ—прышлі як ніколі загартаванымі пад кіраўніцтвам партыі да свайго Х-га зьезду.

Сёньня зьезду рапартавала рабочая моладзь чыгуна-ліцейнага і машынабудаўнічага заводу „Комунар“, чырвонаштандартнай шэйнай Фабрыкі „Кастрычнік“, дзесяткі іншых дэлегацый рабочае моладзі, чырвонага студэнцтва, піонэраў, фабзавучнікаў.

У чым сакрэт нашых перамог?

— Соц. спаборніцтва, ударніцтва, вытворча-бытавыя комуны,—гэтыя нявычэрпныя крыніцы энтузіязму рабочых—вось тое, што дало нам магчымасьць усгупіць у пэрыод соцыялізму.

... Чорныя здані жальбы на хвіліну вырасьлі над заляй. Маўклівым салютам ціха прашуршэлі цені загінуўшых. Хістаючыся ў сядле праплыў з далёкіх Кронштацкіх бастыёнаў Гарасім Фэйгін. З малочна-туманных даляй падняліся комсамольцы партызаны, загінуўшыя ў Белавескай пушчы, лясох Беларусі, стэпах Украіны. Акрываўлены, з перавязанай галавою, ціха прайшоў растрэляны Ботвін... Плячом к плячу ішлі яны... Палкі. Брыгады... Гэроі партызанскіх разьдзелаў...

— „Многіх ужо няма ў нашых шэрагах, няма тых, хто разам з намі будаваў комсамол Літвы і Беларусі і хто разам з намі ішоў на сьмерць за Савецкую Беларусь. Яны загінулі ад крывавай рукі бела-польскага окупанта пад Вільняй у 1920 годзе, у партызанскіх баёх у 1923-25 годзе. Тысячамі загінулі ў катаўнях дэфэнзывы на допытах. Яны дзесяткамі перастрэляны да дэмонстрацыях, забастоўках і экзэкуцыях Палова ўсёй нашай організацыі — у фашысцкіх турмах...“

У турмах гінуць барацьбіты. Але халодныя каменьні турэмных муроў, катаўні дэфэнзывы, экзэкуцыі і допыты, ад якіх за дзесяткі хвілін старэюць на дзесяцігодзьзі. Ці змогуць яны астудзіць рэволюцыйны пыл? Ці зьнішчаць яны энэргію да клясавай барацьбы?

„Дзе загартоўваецца больш усяго моладзь нашай організацыі? Больш усяго загартоўваецца яна ў абставінах непасрэднай грамадзянскай вайны, у абставінах самага жорсткага тэрору... Комсамолу Кітаю, дзе пануе самы жорсткі тэрор, нельга параўнаць з комсамольцамі Норвэгіі, Швэйцарыі, таму што апошнія не прайшлі школы грамадзянскай вайны, не прашлі пэрыоду найцяжэйшага падпольля якое зьяўляецца праверкай найвялікшай гатоўнасьці і памерці за справу комунізму“ (з дакладу тав. Горкіча).

Нядаўна мы атрымалі ліст ад 20 політ-вязьнярак Польшчы. „Голай рукою нас ня возьмеш“,—пісалі яны. „Не зламана клясавая ненавісьць—набліжаецца рэволюцыя ў Польшчы, ідзе і да нас Вялікі Кастрычнік... Вы ў СССР падносіце вялікую як Монблян дулю ўсяму капіталістычнаму сьвету...“*).

Волаты—заводы апаясваюць стан краіны. У Менску павырасталі чыгуна-ліцейныя заводы, швэйныя фабрыкі, у Гомелі—Сельмаш, „Пролетары“ і шэраг іншых, Бабруйскі Комбінат—гэта толькі пачатак сьпісу нашых дасягненьняў. Пад кіраўніцтвам пролетарыяту і яго партыі вёска пасьпяхова ідзе да суцэльнай колектывізацыі, што дае магчымасьць ажыцьцяўляць політыку ліквідацыі кулацтва, як клясы. І праца з цяжкога і зазорнага ярма ператвараецца ў нас у справу пролетарскага гонару.

Тады політ-вязьняркі пісалі:—„Ці праўда, што хутка будзе пабудаваны Асінбуд? Як гэта дзіўна. Памятаю—першы раз прачытала пра Асінбуд. Здавалася мне, што гэта плян далёкай—далёкай будучыні, а вось яно ўжо і рэчаіснасьць...“

Ужо няма Асінбуду, як будаўніцтва. Ёсьць Асінбуская Раённая Сталінская Электростанцыя, ёсьць—Асінэльстан. І за першай чаргой Эльстану растуць магутныя—другая, трэцяя.

Дарагія таварышы! Мы з гонарам пачулі ад прадстаўнікоў КІМ'у, што комсамол Польшчы сапраўды на справе заваёўвае масы. КІМ характарызуе комсамол Польшчы, як адзін з тых нелегальных у Эўропе комсамолаў, якія зьяўляецца лепшай сэкцыяй КІМ'у.



Група дэлегатаў—чырвоных пагранічнікаў

Комсамол Савецкай Беларусі яшчэ недастаткова зьвязаны з вамі і з комсамолам Польшчы. І перад Х зьездам комсамолу мы ставім задачу—прымацаваць кожную раённую організацыю да пэўнага пункту ў Польшчы і Заходняй Беларусі.

І ня толькі словы. Тут-жа на зьезьдзе, адна за другой у парадку соцыялістычнага спаборніцтва дэлегацыі ўносілі сродкі ў карысьць політзьняволеных. Гомельская ўнесла 1000 рублёў і выклікала Віцебскую. Віцебская ўнесла 2000 і выклікала іншых. Так мы на зьезьдзе праводзім практычную работу па дапамозе вам.

Нашы шэрагі непахісны. У агнях клясавай барацьбы, на накавальнях будаўніцтва, пад сьцягамі комуністычнай партыі мы будзем выкоўваць з сябе сапраўдных ленінцаў, пасьлядоўных бальшавікоў.

Верныя сыны Фэлікса Эдмундавіча—чэкістыя гвардыі Дзяржынскага—дэлегацыя войск АДПУ вітала наш зьезд. З вінтоўкамі на руку—знак поўнай гатоўнасьці да абароны нашай краіны—яны рапартавалі зьезду аб гатоўнасьці аддаць сваё жыцьцё за нашу з вамі агульную справу.

На ваш ліст мы адказваем вашымі-ж словамі:

— Хутка надыйдзе ўжо час, калі мы з вамі будзем у адзінай сям'і, будзем будаваць соцыялізм на вызваленай Заходняй Беларусі, аб'яднанай Савецкай Беларусі.

Чангарскія дні грамадзянскай вайны, штурмавыя ночы Перакопу яшчэ будуць. Знойдзецца яшчэ і справа ў парахавым дыме для Будзёнаўскай коньніцы сусьветнага пролетарыяту.

Мы заняты будаўніцтвам. Нам вайна непатрэбна. Паны капіталістыя, халуі—шкоднікі з „Прампартыі“, нацыянал-дэмократы Лёсікі і Цьвікевічы—прэч з дарогі! Не перашкаджайце нам будаваць.

Пройдзеных шляхоў у нас ніхто не адбярэ.

Таварышы політ-вязьняркі, замураваныя ў турмах фашысцкай Польшчы, мы чуем як радасна б'юцца вашы сэрцы, калі да вас даходзяць весткі аб наступе пераможных калён Сусьветнага Кастрычніка.

Буравесьнікі рэволюцыі ўжо распасьцёрлі свае крылы над капіталістычным сьветам. Чорная сутана сьмерці ўжо стукае кастляваю рукой у брамы капіталізму.

На барыкадах хутка, хутка мы сустрэнемся з вамі. Плячом к плячу, разам з партыяй мы будзем з вамі змагацца за сусьветную фэдэрацыю Савецкіх Рэспублік!

Група дэлегатаў X зьезду ЛКСМБ

Менск, X зьезд ЛКСМБ.

*) Паўлюк Трус „Дзесяты Падмурак“.

„За будаўніцтва соцыялізму мы будзем змагацца і мы пераможам“

Прывітаньне тав. Рубашова ад войск АДПУ

Таварышы комсамолія Беларускай рэспублікі! Байцы, камандзіры, комуністыя і комсамольцы Беларускага палка войск АДПУ шлюць баявое полымянае вітаньне (воплескі).

Наш полк—частка Дзяржаўнага Політычнага Кіраўніцтва—атрымаў назву ўдарнага палка Гэтую назву ён атрымаў за баявыя посьпехі на гарнізонных спаборніцтвах. І ў гэтых посьпехах не малую ролю адыгрывалі комсамольцы палка, якія працавалі галоўным чынам над пытаньнямі баявой падрыхтоўкі. Комсамольцы ахоплены на 100 проц. ударніцтвам. На першым месцы палка стаіць палкавая школа, якая мае 95 проц. комсамольцаў (воплескі). Комсамол нашага палка ўзяў шэфства над аружжам (воплескі).

Мы разгарнулі работу па ўцягненьню ўсіх байцоў ва ўдарніцтва і соцспаборніцтва, каб наша баявая вучоба была цалкам і поўнасьцю ўдарнай. Усю гэтую работу па падрыхтоўцы мы праводзілі на аснове рашэньняў 16 зьезду нашай партыі (воплескі).

Наш полк у цэлым даў рашучы адпор паасобным вылазкам клясавага ворага.

Мы разгарнулі рацыяналізатарскую работу, мы разгарнулі работу па культэстафэце (воплескі). За ўсю гэтую работу Цэнтральны Камітэт комсамолу Беларусі прэміяваў наш полк дарадчым мандатам на зьезд (воплескі).

У нас, таварышы, ёсьць шэраг недахопаў, у нас ёсьць адстаючыя байцы. Але мы правялі, спэцыяльна па ініцыятыве комсамольскай організацыі, палкавую ўдарную дэкаду, у якой паставілі задачу, каб у нас у палку ня было ніводнага адстаючага байца. Мы змаглі за гэту дэкаду значна панізіць процант адставаньня і мы даём абяцаньне, што да канца гэтага навучальнага году ў нас ня будзе ні аднаго адстаючага. Наш баявы прамфінплян быў выкананы намі і мы выпрацавалі новы сустрэчны баявы прамфінплян.

Мы заяўляем, што па-першаму закліку нашае партыі, па першаму заклку Рэволюцыйнага Ваеннага Савету мы будзем гатовы ўступіць у бойку і зьбірацца будзем ня дзень, не гадзіну, ня хвіліну, а сэкунды. Мы ўпэўнены ў тым, што ў апошняй рашаючай сутычцы, разам з намі будзеце вы—комсамольцы ўсёй Савецкай Беларусі, будуць усе комсамольцы Савецкага Саюзу.

Разам з вамі мы будзем змагацца. Мы заяўляем нашай партыі, што за будаўніцтва сацыялізму мы будзем змагацца і мы пераможам (бурныя воплескі).

Мы выконваем задачы сусьветнага пролетарыяту

Усе нашыя перамогі набліжаюць яго будучую перамогу

Дэлегацыя БССР у тав. М. І. Калініна

Дэлегацыя БССР у Маскве наведала ўсесаюзнага старасту—т. Калініна.

Тав. Чарнушэвіч ад імя дэлегацыі вітаў у асобе тав. Калініна ЦВК СССР, потым у кароткіх рысах ахарактарызаваў соцыялістычнае будаўніцтва Беларусі. З прывітаньнямі і паведамленьнямі аб рабоце сваіх прадпрыемстваў выступілі: рабочы заводу „Энэргія“—тав. Юрье, старая работніца тэкстыльнай фабрыкі „Дзьвіна“ тав. Нікалаева. Ра очы папяровай ф-кі „Гэрой Працы“ тав. Кілбаса, прадстаўнікі пролетарскіх пісьменьнікаў Беларусі—т. т. Ліманоўскі і Канакоцін, ад яўрэйскай пролетарскай грамадзкасьці тав. Дунец і прадстаўнік беларускіх часьцей Чырвонай арміі—т. Бялашоў.

Тав. Някрашэвіч адзначыў, што Беларусь першая ўзяла ў сябе ўсеагульнага навучаньне.

Вялікую ролю ў гэтай справе адыграла кніга. Тэмпы росту беларускае кніжнае продукцыі вялізарвыя. Калі ў 1920 годзе на Беларусі было выпушчана ўсяго тры назвы в колькасьці 10 тыс экзэмпляраў, дык за 9 месяцаў 1930 году выпушчана 766 назв ў тыражом у 7 млн. экзэмпляраў. Увогуле за 9 мес. 1930 году выпушчана столькі кніг, колькі за ўсе папярэднія 5 год разам

На 1931 год мяркуецца далейшае значнае павялічэньне кніжнай прадукцыі. Аднак, прымаючы пад увагу задачу падцягваньня Беларусі да больш перадавых у культурных адносінах рэспублік Саюзу, тав. Некрашевіч лічыць гэтыя тэмпы росту невыстарчальнымі Ён зварачаецца да ЦВК СССР з просьбаю павялічыць фонд паперы для Беларусі і форсаваць тут пабудову новых друкарань.

Ад імя беларускіх навуковых работнікаў выступіў тав. Сэрбэнта. Ён паказаў, што па Беларусі зараз маецца вялікая навуковая прадукцыя, але ў гэтай продукцыі шмат хламу, шмат шкодніцкага, бо яшчэ ня зжыты ідэолёгічны ўплыў беларускіх нацыянал-дэмократаў. Беларускія нацыянал-дэмократы шчыльна зьвязаны з такімі ідэолёгамі буржуазнай рэстаўрацыі, як профэсар Доўнар-Запольскі, Любарскі і інш., што задаюць тон усім ворагам савецкай улады. Барацьба-ж з ідэолёгамі буржуазнай рэстаўрацыі вядзецца не даволі энэргічна. Барацьбе з вяліка-дзяржаўным шовінізмам таксама аддаецца невыстарчальная ўвага ў працах гісторыкаў-марксыстых Тав. Сэрбэнта просіць дапамагчы беларускім пролетарскім вучоным у барацьбе а ідэолёгічным фронце.

Тав. Калініна які выступіў з адказнай прамоваю, дэлегаты спаткалі бурнымі воплескамі.

— Будаўнікі соцыялізму,—гаворыць усесаюзны стараста,—у сваёй рабоце натыкаюцца на супярэчнасьці, якія ўлады, акрамя савецкай, другой партыі, апрача комуністычнай, якая-б магла лепш змагацца за іх інтарэсы.

Адгэтуль для рабочага і селяніна няма іншага шляху, апрача таго, па якім ідзе савецкая ўлада. Што-ж датычыць інтэлігенцыі, дык у сьвядомасьці гэтай апошняй павінна была адбыцца вялікая рэволюцыя, патрэбна была вялікая ўнутраная барацьба, каб рашыцца пайсьці разам з савецкаю ўладаю. Частка інтэлігэнтаў пайшла разам з савецкай уладай, другая апынулася па той бок лініі барацьбы. Адгэтуль—ідэалёгічнае і практычнае шкодніцтвы, якія нам на працягу 10 год рабілі шкоднікі.

Гэтыя грамадзкія процэсы не зьяўляюцца навіною для людзей, знаёмых з класычнымі творамі марксызму—ленінізму. Здраду часткі інтэлігенцыі ў пераходны пэрыод Маркс прадбачыў з вялікай дакладнасьцю. Таму моладзь, якая зараз з энтузіязмам будуе новае жыцьцё, якой кідаюцца ў вочы гэтыя супярэчнасьці, не павінна паслабляць сваёй творчай энэргіі.

Га оўнае—цьвёрдае перакананьне ў тым, што мы выконваем задачы сусьветнага пролетарыяту і ўсе нашы перамогі (аб гэтым асабліва добра павінна памятаць нашы нацыянальныя рэспублікі) набліжаюць яго будучую перамогу. Расійскі пролетарыят сілаю рэчаў выштурхваецца ў якасьці авангарду на міжнародную арэну, тады, як для малых народаў заўседы існуе небясьпека замкнуцца ў сябе.

Нашы посьпехі,—гаворыць далей тав. Калінін,—аказаліся магчымымі дзякуючы дыктатуры пролетарыяту і саюзу яго з працоўным сялянствам. Беларусь знаходзіцца на мяжы з капіталістычным сьветам. Яна першая павінна будзе прыняць удар імпэрыялістых, накіраваны супроць Савецкага Саюзу. Вось для чаго, каб умацаваць абараноздольнасьць нашай краіны, трэба разьвіваць і паляпшаць колектыўныя сялянскія гаспадаркі. Ніякія бэтонныя цытадэлі, сучасныя гарматы не пазбавяць нас небясьпекі так, як гэта зробіць колектывізацыя.

Нарэшце, тав. Калінін, вітаючы дэлегацыю, пажадаў рабочай клясе і працоўнаму сялянству Беларусі далейшых посьпехаў у соцыялістычным будаўніцтве.

Ад імя дэлегацыі т. Паўлюкевіч вынес падзяку т. Калініну за сяброўскі пролетарскі прыём. Сваю прамову тав. Паўлюкевіч скончыў выказам цьвёрдай упэўненасьці ў тым, што барацьба пролетарыяту і працоўнага сялянства ўсяго СССР за пабудову соцыялізму скончыцца поўнай перамогай.

„Тыдзень Савецкай Беларусі“ ў г. Маскве



На здымку: Плякат „Беларусь да Кастрычніка“, устаноўлены на Тэатральнай плошчы

...зусім зразумелыя з пункту гледжаньня тых тэмпаў, якімі разгортваецца соцыялістычнае будаўніцтва Наша краіна гіганцкімі крокамі ідзе наперад. Але з другога боку ў нашай рэчаіснасьці ёсьць яшчэ шмат старога, якое адмірае толькі паступова.

Мы будуем зараз волаты індустрыі, а ў пяці кроках ад іх яшчэ жывуць халупы на „курыных ножках“ нявылазная гразь. З гэтымі супярэчнасьцямі на працягу пераходнага пэрыоду мы будзем пастаянна спатыкацца. Аб гэтым нельга забывацца.

Нашы агульныя дасягненьні, у прыватнасьці—дасягненьні Беларусі атрыманы ў выніку выключнага напружаньня сіл рабочае клясы і бядняцка-серадняцкіх мас сялянства. Рабочая кляса ведае, што будуючы соцыялізм у СССР, яна робіць справу сапраўднага вызваленьня ўсяго міжнароднага пролетарыяту. Калі-б ня было гэтае сьвядомасьці, мы-б і не дамагліся такіх буйных посьпехаў.

Будаўніцтва соцыялізму,—гаворыць ён,—перш за ўсё азначае палепшаньне матар'яльнага становішча мільёнаў мас рабочых і сялян. У стары час бюджэт беларускага селяніна, а ьбо рабочага ледзь дасягаў 100 руб. у год, жылі яны барбарскі. Зараз матар'яльнае становішча беларускага рабочага і селяніна ў некалькі разоў лепш. Што год яно ўсе паляпшаецца. Таму зусім зразумела, што яны ня бачаць другой

На высокім узроўні політычнай пільнасьці

Верныя традыцыям бальшавізму—дэлегаты зьезду даюць руйнуючы адпор опортуністычным наскокам

Ад часу IX да X зьезду ЛКСМБ пройдзен слаўны, баявы шлях барацьбы за генэральную лінію партыі; наш саюз атрымаў шмат новых перамог, дабіўся значных посьпехаў у барацьбе за комуністычнае выхаваньне працоўнай моладзі Беларусі, у барацьбе за выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады, за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі,—стварыў у асноўным паварот тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі.

Шлях, які ляжыць паміж IX і X зьездам і ЛКСМБ, характарны тым, што ЛКСМБ надзвычайна вырас як організацыйна, так і ідэёва ўмацаваўся ў горне соцыялістычнай будоўлі, загартаваўся ў агні клясавых боек.

Гэтых посьпехаў мы дасягнулі дзякуючы таму, што заўсёды ішлі пад сьцягам генэральнай лініі комуністычнай партыі былі і будзем вернымі памочнікамі ў яе барацьбе з усякімі адхіленьнямі, як правым ухілам, які зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе, так і рэшткамі контррэволюцыйнага троцкізму, з права-„лявацкім“ беспрынцыпным блёкам і прымірэнцтвам да іх.


Усё гэта сьведчыць аб значна ўзросшай політычнай актыўнасьці саюзу і аб тым, што комсамол у асноўным пасьпяхова працаваў пад ажыцьцяўленьнем рашэньняў партыі і комсамолу

Напярэдадні X зьезду комсамолу Беларусі, на прайшоўшых раённых конфэрэнцыях ЛКСМ, правыя опортуністыя, наскакваючы на лінію партыі, імкнуліся працягнуць у комсамоле тэорыю „аб крызісе актыўнасьці“, аб „таптаньні на месцы“ і г. д. Комсамол Беларусі даў руйнуючы адпор гэтым яўна права-опортуністычным выступленьням, мобілізаваўшы масы комсамольцаў і рабочай моладзі на яшчэ больш энэргічную работу па ўдзелу у гаспадарча-соцыялістычным будаўніцтве, на непрымірымую барацьбу з усякага роду адхіленьнямі ад ленінскай лініі нашай партыі.

Аднак і на самым зьезьдзе паасобныя людзі, заблытаўшыся у опортуністычных сетях, імкнуліся працягнуць свае гнілыя опортуністычныя „тэорыйкі“.

Стаўшы ў позу „сыгналізатараў“, сэкратар Чашніцкага РК ЛКСМБ Шурыц заявіў, што комсамольская організацыя ва многіх мясцох ня можа спраўляцца з тымі задачамі, якія стаяць перад сельскай гаспадаркай у справе яе соцыялістычнай рэконструкцыі, і што з-за адсутнасьці экономічнай работы мы ня маем росту за кошт рабочай моладзі. Гэтыя выступленьні, як і ўсе правыя выступленьні, з усёй

9-га на вячэрнім паседжаньні X-га Зьезду сакратар Чашніцкага РК КСМ Шурыц выступіў з права опортуністычнай „тэорыяй“ сьцьвярджаючы што „комсамол вёскі ня можа справіцца з тымі задачамі, якія высунуты партыяй на вёсцы“.



Енк з опортуністычнага балота

яскравасьцю гавораць аб тым, што Шурыц ня бачыць ужо зробленага ў асноўным павароту організацыі тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі, ня бачыць тых посьпехаў, якіх дамогся комсамол пад кіраўніцтвам партыі ў галіне ажыцьцяўленьня задач соцыялістычнай рэконструкцыі сельскай гаспадаркі.

Шурыц ня бачыць праз свае права-опортуністычныя акуляры ўзросшай політычнай актыўнасьці нашага саюзу.

Паклёпніцкія верашчаньні Шурыца сустрэлі хвалю абурэньня з боку дэлегатаў зьезду. Дэлегаты зусім справядліва патрабуюць тэрміновага правядзеньня агляду работы Чашніцкай райорганізацыі. Верныя традыцыям бальшавізму, лепшыя сыны ленінскага комсамолу—дэлегаты зьезду—з уласьцівай бальшавікам пільнасьцю, непахісна стаяць на варце генэральнай лініі партыі.

Дэлегаты жорстка асудзілі паклёпніцкія заявы сэкратара Сьмілаўскага райкому ЛКСМБ т. Вольскага, які ў сваім выступленьні імкнуўся давесьці, што ў перагібах па колгаснаму будаўніцтву вінаваты ЦК Ус ЛКСМ.

Сваім выступленьнем, як і ўсе правыя, ён хацеў прыкрыць політычныя памылкі, якія мелі месца ў колгасным будаўніцтве, падпарадкаваць рэвізіі генэральную лінію партыі, якая зьяўляецца лініяй ЦК УсеЛКСМ.

Гэты наскок на ЦК УсеЛКСМ зьяўляецца характэрным адлюстраваньнем атак правых на кіраўніцтва партыі—на яе Цэнтральны Камітэт.

Па-за політычнай зіркасьцю дэлегатаў не прайшлі і такія, на першы погляд „нявінныя“ сьцьвярджэньні, як заява Фрумкінай.

Усьлед за правільнай крытыкай недахопаў работы організацыі т. Фрумкіна імкнулася давесьці аб наяўнасьці „таптаньня на месцы“ у шэрагу організацый.

У такім контэксьце, калі бярэцца вялікая частка організацый, заявы аб „таптаньні на месцы“ набываюць кроўную сувязь з опортуністычным енкам аб „крызісе“. Зьезд даў рашучы адпор усім, хто імкнуўся, раўняючыся на „вузкія месцы“, дэзорыентаваць саюз, цягнуць яго назад. Да такіх выступленьняў трэба аднесьці заяву тав. Вайнштэйна, які сьцьвярджаў, што вясковы комсамол стаіць толькі папярэдадні павароту тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі.

Той уздым, тая політычная вышыня, на ўзроўні якое праходзяць абмеркаваньні пытаньняў на зьезьдзе, зьяўляецца яшчэ адным суровым прысудам усім і ўсякім опортуністым.

Пад кіраўніцтвам партыі Леніна стварыўшы ў асноўным паварот тварам да задач соцыялістычнай рэконструкцыі, даючы рашучы адпор усялякім опортуністычным наскокам, концэнтруючы галоўны агонь на правым ухіле, бязьлітасна б'ючы па „левых“ перагібах—ЛКСМБ ідзе да новых перамог.

С. У.

Зачыненьне „Тыдню Савецкай Беларусі“

Пазаўчора ў Вялікім Тэатры зачыніўся беларускі тыдзень.

А 8-ай гадзіне ўвечары пачалося ўрачыстае паседжаньне. Вялікі Тэатр перапоўнены. Сэсія ЦВК у поўным складзе зьявілася на паседжаньне. На трыбуне прадстаўнікі СССР і БССР. Глядзельня і сцэна ўбраны лёзунгамі на беларускай мове.

З вялікім дакладам аб гаспадарчым і культурным будаўніцтве Беларусі выступіў намесьнік старшыні Саўнаркому Беларусі тав. Бэнэк, спатканы бурнымі воплескамі. Усьлед за тым выступалі: прадстаўнікі Комуністычнай акадэміі, літаратурных організацый і маскоўскага гарнізону.

Пасьля паседжаньня быў наладжан грандыёзны концэрт, на якім побач з народнымі артыстымі рэспублікі выступалі беларускія, яўрэйскія і польскія артыстыя.

На паседжаньні былі агалошаны некаторыя лічбы, якія характарызавалі беларускі тыдзень. За гэты час на вечарох змычкі з беларускімі рабочымі пабывала звыш 100.000 маскоўскіх рабочых. Беларускія выстаўкі наведала 30.000 чалавек. Прачытана звыш 20 дакладаў аб Савецкай Беларусі.

Заўтра частка дэлегацыі выяжджае ў Менск. Астатнія дэлегаты будуць яшчэ некалькі дзён праводзіць змычкі на маскоўскіх прадпрыемствах.

„Тыдзень Савецкай Беларусі“ абвешчан зачыненым а 12-ай гадзіне 45 хвілін ночы.

НА ПРАВІЛЬНЫМ ЛЕНІНСКІМ ШЛЯХУ

УсеЛКСМ, пасьпяхова выконваючы пад выпрабаваным кіраўніцтвам комуністычнае партыі высунуты VIII зьездам лёзунг,—дабіўся у асноўным павароту комсамолу тварам да вытворчасьці і вялікіх посьпехаў у галіне соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі

(З спрэчак па дакладу тав. Наумава)

8 студзеня, на ранішнім паседжаньні, зьезд заслухаў канец дакладу тав. Наумава, пасьля чаго разгарнуліся багатыя спрэчкі па гэтаму дакладу. Першым у спрэчках выступіла т. Фрумкіна (Менск).

Час, у які мы зараз працуем,—кажа яна,—па сутнасьці зьяўляецца часам, які даў магчымасьць нашай комсамольскай організацыі яшчэ больш загартавацца ў клясавай барацьбе.

Практычны ўдзел нашай комсамольскай організацыі ў ажыцьцяўленьні пяцігодкі ў чатыры гады, паварот, які мы зараз адзначаем, зьяўляецца нашым галоўным шляхам, шляхам клясавага ўзброеньня.

Ня гледзячы на тое, што значная частка, большая частка комсамольскай організацыі займалася пытаньнямі гаспадарчага парадку, шэраг комсамольскіх організацый прабаваў зьвесьці іх да агульных мерапрыемстваў, без конкрэтнай увязкі паміж паасобнымі конкрэтнымі мерапрыемствамі з агульнымі гаспадарча-палітычнымі задачамі.

Далей кажа тав. Фрумкіна, што значная доля віны падае на кіраўніцтва. Мы да гэтага часу не здаволены дырэктывамі кіраўніцтва. І, бязумоўна, там дзе ня было належным чынам пастаўлена кіраўніцтва (транспарт і іншыя галіны), там мы маем найбольшыя прарывы ў выкананьні вытворчых плянаў.

За два з паловай гады мы маем прырост комсамольскай організацыі на 48 проц.—кажа далей т. Фрумкіна,—але я лічу надзвычайна нездавальняючым колькасны прырост за лік пролетарскай моладзі. Ці можа нас задаволіць прырост 48 проц. у комсамоле рабочай моладзі? Бязумоўна не. Гэта кажа аб тым, што мы, мобілізуючы моладзь на выкананьне пастаўленых перад намі задач, організацыйна не замацавалі як сьлед актыўнасьць рабочай моладзі.

Змагацца за марксысцка-ленінскія веды

Мы маем значны політычны ўздым рабочай моладзі, на нашых вачох адбываецца значны рост яе політычнай актыўнасьці, але разам з гэтым, мы павінны констатаваць, што прасоўваньне марксысцка-ленінскіх ведаў у комсамольскую організацыю і рабочую моладзь не пастаўлена на належную вышыню. Мы павінны ясна сказаць, што нашыя політшколы працуюць дрэнна і не задавальняюць патрабаваньняў рабочай моладзі.

Тав. Фрумкіна ў заключэньне сваей прамовы, гаворачы аб недахопах у рабоце організацыі, заявіла, што мы маем „таптаньне на месцы“ шэрагу організацый.

Гэтая заява, як і трэ' было чакаць, сустрэла рашучы адпор з боку дэлегатаў зьезду. Заява аб „таптаньні на месцы шэрагу організацый“ мае кроўную сувязь з права-опортуністычнымі енкамі аб „крызісе актыўнасьці“.

Тав. Фрумкіна яшчэ не падпарадкавала крытыцы сваю яўна-опортуністычную заяву.

Тав. Вольфсон (Віцебск)—спыняецца на становішчы працы з рабочай моладзьдзю. Мы ведаем,—кажа ён,—што да ліквідацыі акруг пры саюзах былі штатныя працаўнікі сярод рабочай моладзі. Пасьля ліквідацыі акруг мы гэтага ня маем. Я бяру прыклад з нашага саюзу тэкстыльшчыкаў. У нашым Цэнтральным праўленьні на сёньнешні дзень няма працаўніка моладзі, а калі мы паглядзім, якую колькасьць складае моладзь у тэкстыльнай прамысловасьці, то ўпэўнімся, што такі працаўнік нам зьяўляецца надта неабходным. На нашых фабрыках знаходзіцца каля 65-70 проц. рабочай моладзі.

У заключэньне тав. Вольфсон спыняецца на пытаньнях росту. У „Чырвонай Зьмене“,—кажа ён,—быў зьмешчаны артыкул аб росьце комсамолу, які павінен орыентаваць нашу організацыю ў пытаньнях росту, але ў гэтым артыкуле нічога ня сказана аб росьце за лік серадняцкай моладзі, якая на сёньнешні дзень уліваецца ў вытворчасьць. Як мы павінны прымаць нашу серадняцкую моладзь, што прышла на вытворчасьць як мы павінны падыйсьці да прыёму яе ў саюз?

Армейскі комсамол на варце

Тав. Капусьцін.—Армейскі комсамол па-бальшавіцку змагаўся за выкананьне і перавыкананьне кантрольных лічбаў. У нас вялася вялікая праца па пытаньню соц. спаборніцтва і ўдарніцтва. Комсамольская організацыя абвясьціла сябе ўдарнай па выкананьню кантрольных лічбаў. Адначасова з гэтым трэба адзначыць недастатковае кіраўніцтва з боку адпаведных комсамольскіх органаў. Я-бы прапанаваў склікаць спэцыяльную нараду комсамольскіх організацый Чырвонай арміі, бо ў адносінах кіраўніцтва справа пастаўлена далёка нездавальняюча.

Тав. Лапіцкі.—ЦК УсеЛКСМ працуе зараз у абставінах разгорнутай клясавай барацьбы. Ён рухаў саюз па шляху аўладаньня ўсімі вучасткамі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва нашай краіны. ЦК УсеЛКСМ абсьледаваў цэлы шэраг організацый. Выкрыў балячкі і прарывы ў рабоце Смаленскай організацыі і інш. Ён давёў, што саюз у асноўным можа будаваць і сапраўды павярнуўся тварам да вытворчасьці. Зьмена кіраўніцтва ў шэрагу організацый паказвае, што былі паасобныя зьвеньні, дзе сядзелі людзі, якія не маглі кіраваць нашай організацыяй.

Далей тав. Лапіцкі гаворыць аб конкрэтнай працы ЦК ЛКСМБ па ажыцьцяўленьню конкрэтных мерапрыемстваў, правадзімых Усесаюзным комсамолам.

Спыняецца на пытаньнях росту. У далейшым неабходна будзе ўзмацніць рост за лік кваліфікаванай моладзі. Адносна раёнаў суцэльнай колектывізацыі. Бязумоўна, трэба здавальняць патрабаваньні лепшай часткі бядняцка-серадняцкай моладзі і асабліва-серадняцтва, якія давялі на практычнай працы сваю адданасьць. Мы маем такія факты, калі ў раёнах ня суцэльнай колектывізацыі, як Аршаншчына, серадзякі атрымоўваюць рэкомэндацыі ад членаў партыі і ўступаюць у комсамол, бо партыец бярэ яго пад сваю апеку. Трэба па гэтым ударыць.

Біць па панікёрах і ныцікках

Беразоўскі.—Комсамол, які працуе пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі, здолеў давесьці на справе, што ён можа сапраўды па-бальшавіцку праводзіць лінію партыі ў жыцьцё. Можа моцна біць па тых, хто паклёпнічае на комсамол, бо ня верыць у творчыя здольнасьці рабочае клясы і яе састаўную частку—рабочую моладзь. Высунуты VIII зьездам УсеЛКСМ лёзунг—„тварам да вытворчасьці“, быў праведзен у жыцьцё. Аб гэтым гаворыць паварот комсамольскай організацыі.

Я хачу спыніцца,—кажа далей тав. Беразоўскі,—на падрыхтоўцы кадраў. Мы на гэта важнае пытаньне зьвяртаем мала ўвагі, яно не заняло патрэбнага месца ў комсамольскай організацыі. У нас штогод выпушчаюць рабочых з фабзавучу, але яны дрэнна скарыстоўваюцца на вытворчасьці. Шэраг комсамольскіх організацый недаацэньваюць гэтага пытаньня.

Дакладчык зусім ня спыняўся на пытаньні вайсковай працы. На гэту працу мала зварачваюць увагі.

Апошняе пытаньне—гэта абмен вопытам. У некаторых організацыях, як напрыклад, у Маскоўскай вобласьці, ёсьць шмат багатага вопыту. Трэба сконцэнтраваць гэты вопыт. Праўда, „Комсамольская Правда“ зрабіла некалькі крокі ў гэтым кірунку, але недастатковыя.



Дэлегат зьезду—Лігум („Лесзавод № 13“ Віцебск)


Узмацніць політ-выхаваўчую працу

Тав. ВІЛКОЎ („Парыская Комуна“) Першае пытаньне, на якім я лічу патрэбным спыніцца, гэта пытаньне політычнага выхаваньня і адукацыі комсамолу. Трэба адзначыць, што комсамольская організацыя пытаньнем політычнай адукацыі займаецца ў недастатковай меры і што комсамол не навучыўся зьвязваць пытаньні ўдарніцтва і соцспаборніцтва з політычнай падрыхтоўкай комсамольцаў. Нашы гурткі, нашы комсамольскія школы падчас адарваны ад вытворчасьці. Пытаньні, над якімі працуе комсамол на вытворчасьці, у школе адбітку ня маюць.

Калі гаварыць аб політычнай падрыхтоўцы нашых комсамольцаў трэба проста сказаць, што той кадр, які мы перадаем у партыю, політычна падрыхтаваны слаба. ЦК ЛКСМ пытаньнямі політ-адукацыі займаўся, па-мойму, недастаткова.

Наступнае пытаньне, якім ЦК комсамолу займаецца мала, альбо недастаткова—гэта пытаньне комсамольскай організацыі арміі і флёту. Роля комсамолу ў арміі і ва ўсёй сыстэме ўзброеных сіл Савецкай краіны займае ў апошні час асабліва вялікае значэньне. Калі ў мінулым комсамольская організацыя арміі і флёту аказвала дапамогу ў паасобных пытаньнях, дык зараз яна цалкам перашла да выкананьня сваёй задачы па навучальнай баявой падрыхтоўцы. ЦК комсамолу ў галіне кіраўніцтва вайсковым і флёцкім комсамолам правёў недастатковую працу.

У заключэньні я жадаў-бы адзначыць, што грамадзянскія і вайсковыя організацыі комсамолу, пад правільным кіраўніцтвам Ленінскага ЦК комсамолу тыя задачы, якія пастаўлены перад комсамолам партыяй у рэконструкцыйны пэрыод выканаюць. Комсамол да 9-га зьезду прыдзе адзінай штурмавой брыгадай па выкананьню задач 3 рашаючага году пяцігодкі.



Старат лыжнай эстафэты да X зьезду ЛКСМБ на Пляцы Волі ў г. Менску

Паварот ёсьць—трэба яго замацаваць

Тав. МЕЛЬНІКАЎ (Бабруйск). Я лічу, што ня будуць мець рацыі і тыя таварышы, якія кажуць, што наш комсамол не павярнуўся тварам да гаспадарчага будаўніцтва. Я лічу, што наш комсамол павярнуўся тварам да вытворчых задач, але трэба сказаць, што на вёсцы яшчэ няма разгорнутай работы ў гэтай галіне, вясковаму комсамолу трэба перабудавацца.

Я чуў выступленьні т. Фрумкінай, якая гаварыла аб тым, што ў нас топчуцца на месцы. Я лічу гэта выступленьне т. Фрумкінай ня верным, бо калі мы топчамся на месцы, дык мы бязумоўна павінны пацярпець крызіс. Гэтае выступленьне т. Фрумкінай няверное, бо яно працягвае опортуністычнае выступленьне Бутыркіна, Целешава і інш.

Тав. Грыневіч (Віцебск).—Мобілізацыя мас на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады адыгрывае найвялікшую ролю. Ад таго, наколькі мы здолеем скалаціць вакол сябе комсамольскі актыў і накіраваць усю комсамолію на выкананьне асноўных задач, якія стаяць перад комсамолам, ад гэтага залежыць пасьпяховае выкананьне намечаных плянаў.

Побач з пытаньнем мобілізацыі мас, мы павінны ўзьняць пытаньне аб растаноўцы сіл у рацыяналізацыі часу. Мы павінны ў сваёй далейшай рабоце па-бальшавіцку ўкладвацца ў дадзены час, скарыстоўваючы кожную хвіліну для пасьпяховай барацьбы і перамог.



Дэлегатка зьезду—Ліомковіч, (завод „Чырвоная Зара“ Менск)

Далей выступалі т. т. Пліс (Крупкі), Сапега (Полацак), Камісарчык, Ракіна і інш. У сваіх выступленьнях яны адзначылі слабую працу па росту комсамолу, некаторыя няяснасьці ў пытаньнях прыёму ў комсамол серадняцкай моладзі, аб чым зьезд павінен сказаць сваё слова. Таксама былі адзначаны конкрэтныя мерапрыемствы комсамолу па пасылцы на Донбас, а таксама нездавальняючая падрыхтоўка да гэтай справы. Некаторыя дэлегаты адзначалі, што праца сярод дзяўчат знаходзіцца ў заняпадзе.

Вялікае месца ў спрэчках адведзена піонэр-працы. Піонэр-працай яшчэ ня ўсе комсамольскія організацыі займаюцца так, як гэта патрэбна.

Вячэрняе паседжаньне 9 студзеня

З ЗАЛІ ЗЬЕЗДУ

* Званок старшыні. Шум у залі паступова сьціхае.

* Ідуць спрэчкі па справаздачы ЦК ЛКСМБ.

* ... „Пад выпрабаваным ленінскім кіраўніцтвам комуністычнай партыі комсамол вёў, вядзе і будзе несьці бязьлітасную барацьбу з усімі тымі, хто перашкаджае будаўніцтву соцыялізму. Комсамол і надалей будзе пад кіраўніцтвам партыі штурмаваць гаспадарчыя перакопы“,—вось аднадушныя заявы дэлегатаў.

— Комсамольскія ячэйкі чыгуначнага вузла Воршы,—кажа тав. **Галкоўскі**,—асабліва зараз стараюцца ўсімі сіламі вывесьці з вузкага месца вузел, але транспартнымі ячэйкамі яшчэ ня кіруюць, як належыць, не зьвяртаюць на іх неабходнай увагі.

* Дэлегат **Калінковіч**, спыняючыся на недахопах у працы Мазырскага раёну, гаворыць, што комсамольскія організацыі не абменьваюцца вопытам працы, што газэта „Чырвоная Зьмена“ з-за малога фармату ня можа як належыць дапамагчы комсамольскім організацыям у абмене вопытам.

* Сэкратар Чашніцкага раёну тав. **Шурыц** імкнуўся давесьці зьезду правільнасьць думкі Целешава, што быццам у вясковай комсамольскай організацыі—крызіс актыву, што неабходна з гораду прысылаць у колгасы кіраўнікоў комсамольскіх ячэек, што быццам вясковы комсамол не спраўляецца з працай.

Але „тэорыя“ Шурыца, як і ўсіх правых опортуністых, сустрэла рашучы адпор з боку зьезду.

* Тав **Бэтхэр**, выступіўшы пасьля Шурыца, фактамі разьбівае ўшчэнт паклёпніцкіх „ідэйкі“, якія імкнуўся працягнуць Шурыц.

— Калі ў адным з колгасаў нашага раёну быў прарыў, дык комсамольская ячэйка, у колькасьці 14 чалавек, працавала па 24 гадзіны ў суткі і ліквідавала гэты прарыў, за што атрымала прэмію.

Побач з гэтым ён падкрэсьлівае невыстарчальнае кіраўніцтва раёнамі з боку ЦК ЛКСМБ і партыйных організацый.

* Тав. **Красільнікаў**.—Некаторыя комсамольцы яшчэ не разумеюць як належыць, што асабліва зараз разгортваецца клясавая барацьба, а таму райкомы павінны больш кіраваць ячэйкамі, больш праводзіць выхаваўчую працу.

* Тав. **Сянькевіч** на фактах даводзіць няправільнасьць сьцьвярджэньняў Шурыца аб тым, што вясковы комсамол не спраўляецца з працай.

— Але побач з гэтым—гаворыць тав. **Сянькевіч**,—у некаторых мясцох РК слаба кіруюць ячэйкамі, а таму некаторыя ячэйкі прамаргалі паасобныя кампаніі.

Тав. **Цярэнцеў** завастрае ўвагу дэлегатаў зьезду на тое, што комсамольскія ячэйкі паасобных раёнаў паасобных колгасаў мала займаюцца пытаньнем унутрыколгаснага будаўніцтва. Далей тав. Цярэнцеў падкрэсьлівае дрэнныя бакі падрыхтоўкі кадраў у Магілеўшчыне і адзначае, што „Чырвоная Зьмена“ недастаткова зьвяртае ўвагі вясковым ячэйкам.

* Тав. **Ільлічоў** застанавіўся на пытаньні сувязі з Чырвонай арміяй і вывучэньні вайсковай справы актывам.

— Комсамольскі актыў,—гаворыць Ільлічоў,—не падрыхтоўваецца ў ваенных адносінах.

У спрэчках выказалася 16 чалавек.

* Зьезд вітала Менская гарадзкая комсамольская організацыя і беспартыйная рабочая моладзь.

АДКАЗНЫ РЭДАКТАР—
РЭДКОЛЕГІЯ

Галоўлітбел № 599

Друкарня імя тав. Сталіна